# БЕЛАРУСКІ УНІВЕРСІТЭТ

ГАЗЕТА БЕЛАРУСКАГА ОРДЭНА ПРАЦОЎНАГА ЧЫРВОНАГА СЦЯГА ДЗЯРЖАЎНАГА УНІВЕРСІТЭТА

ГАЗЕТА ЎЗНАГАРОДЖАНА ГАНАРОВАЙ ГРАМАТАЙ ВЯРХОЎНАГА САВЕТА БССР

ЧАЦВЕР
4 ЧЭРВЕНЯ
1992 ГОДА
№ 10(1676)


## ЧЫРВОНЫ РАДОК

*У сувязі з эканамічнай сітуацыяй (скарачэнне прамысловасці, колькасці працоўных месцаў) існуюць пэўныя цяжкасці з працаўладкаваннем выпускнікоў вытворчых патокаў БДУ. Прадпрыемствы адмаўляюцца прымаць выпускнікоў. Таму мяркуецца ў бліжэйшы час збалансаваць набор студэнтаў і попыт на выпускнікоў адпаведных факультэтаў.*

* * *

*У гэтым годзе абітурыенты БДУ на ўступных экзаменах на ўсіх (!) факультэтах будуць здаваць беларускую мову і літаратуру вусна як конкурсны экзамен (акрамя тых, хто ў школе па гэтай дысцыпліне не атэставаны).*

* * *

*З наступнага года на прыродазнаўчых факультэтах, а таксама на гістарычным выкладанне будзе весціся на беларускай мове. Каля 250 выкладчыкаў БДУ атрымалі «залік» на курсах па вывучэнню беларускай мовы. Аднак паўнацэнны пераход на родную мову ўскладняе адсутнасць адпаведных падручнікаў. Таму мяркуецца выдаваць хаця б тэрміналагічныя слоўнікі «для ўнутранага карыстання».*

## ЗВАРОТ

### РАБОЧАЙ ГРУПЫ КАМІСІІ ВЯРХОЎНАГА САВЕТА ПА АДУКАЦЫІ, КУЛЬТУРЫ І ЗАХАВАННЮ ГІСТАРЫЧНАЙ СПАДЧЫНЫ ПА ПАДРЫХТОЎЦЫ МАТЭРЫЯЛАЎ ПА РЭФАРМАВАННЮ ДЗЕЙНАСЦІ БЕЛАРУСКАГА ДЗЯРЖАЎНАГА УНІВЕРСІТЭТА ДА КІРУЮЧЫХ РАБОТНІКАЎ, ВЫКЛАДЧЫКАЎ І СТУДЭНТАЎ БДУ

У Пастанове рэспубліканскай канферэнцыі «Беларуская мова і нацыянальна-дзяржаўны суверэнітэт Рэспублікі Беларусь», якая прайшла ў Мінску 15 мая г. г. з удзелам адказных работнікаў органаў дзяржаўнай улады і кіравання рэспублікі, прадстаўнікоў грамадска-палітычных і культурна-асветных арганізацый, творчых саюзаў, работнікаў сацыяльна-культурнага комплексу Беларусі, а таксама ў шэрагу артыкулаў і выступленняў у сродках масавай інфармацыі, зваротах у органы дзяржаўнай улады і кіравання грамадскіх арганізацый і асобных грамадзян, тым лікам і выкладчыкаў, студэнтаў Белдзяржуніверсітэта, настойліва ставіцца пытанне аб стане і перспектывах развіцця навучальна-выхаваўчага працэсу і даследчыцка-навуковай дзейнасці ў флагмане вышэйшай школы Рэспублікі Беларусь — Беларускім дзяржаўным універсітэце. Выказваецца думка, што БДУ павінен стаць сапраўды нацыянальным цэнтрам, нервам інтэлектуальнага жыцця Бацькаўшчыны, рэальна спрыяць станаўленню нацыянальнай сістэмы адукацыі, навукі і культуры ў адпаведнасці з арт. 9 Дэкларацыі аб дзяржаўным суверэнітэце Рэспублікі Беларусь і Законамі Рэспублікі аб адукацыі і аб мовах.

Разам з тым, у сувязі з наданнем статусу універсітэтаў (акадэмій) шэрагу былых галіновых навучальных устаноў рэспублікі, а таксама ў выніку разбурэння сістэмы адукацыі былога СССР і заканамернай адмовы ад сфармаванай ёю канцэпцыі развіцця і дзейнасці Беларускага дзяржаўнага універсітэта рэальна паўстала пытанне аб месцы БДУ у структуры сістэмы адукацыі Беларусі.

Камісіяй Вярхоўнага Савета Рэспублікі Беларусь па адукацыі, культуры і захаванню гістарычнай спадчыны створана рабочая група з ліку народных дэпутатаў Рэспублікі, выкладчыкаў шэрагу ВНУ г. Мінска, работнікаў іншых галін сістэмы адукацыі па вывучэнню пытання аб мэтазгоднасці правядзення карэннай рэформы навучальна-выхаваўчага працэсу і навукова-даследчай дзейнасці і звязанай з гэтым рэарганізацыі БДУ з мэтай пераўтварэння яго ў сапраўды нацыянальную дзяржаўную ўстанову ў адпаведнасці з роляй і месцам Беларускага дзяржаўнага універсітэта ў сістэме айчыннай адукацыі.

Дзейнасць рабочай групы мяркуецца падагуліць да канца чэрвеня г. г. і ў адпаведнасці з рашэннем камісіі Вярхоўнага Савета падрыхтаваныя ёю матэрыялы і праекты дакументаў вынесці на разгляд Прэзідыума Вярхоўнага Савета Рэспублікі Беларусь пры абмеркаванні пытання аб ходзе выканання Закона аб мовах у Рэспубліцы Беларусь.

Звяртаемся да кіруючых работнікаў розных узроўняў, да выкладчыкаў і студэнтаў Белдзяржуніверсітэта з заклікам усяляк спрыяць дзейнасці рабочай групы па падрыхтоўцы адпаведных матэрыялаў, прадастаўляць неабходныя звесткі, выходзіць з прапановамі з той мэтай, каб сумеснымі намаганнямі дабіцца пераўтварэння Беларускага дзяржаўнага універсітэта ў нацыянальны як па форме, так і па зместу.

Каардынаты рабочай групы: 220016 г. Мінск, Вярхоўны Савет, Камісія па адукацыі, культуры і захаванню гістарычнай спадчыны; тэлефон 29-34-00, 21-71-50 Мікалай Іванавіч Савіцкі, кіраўнік рабочай групы.

## МІСІЯНЕР «НАВУКІ РОЗУМУ»

Дваццаціпяцігадовы амерыканец доктар Чрэвіс — прадстаўнік міжнароднай асацыяцыі «Навука Розуму» — знайшоў аднадумцаў у Маскве, Пецярбурзе, Кіеве. У Мінску Чрэвіс выступаў упершыню і прачытаў дзве лекцыі на гістарычным факультэце. Доктар — паслядоўнік заснавальніка «Навукі Розуму» Эрнэста Холмса, які аднойчы вырашыў супаставіць рэлігіі свету і прыйшоў да думкі, што ўсе яны надзіва сугучныя. «Навука Розуму» — неразрыўная частка новага мыслення як прынцыпа жыцця, як філасофіі. Назіраецца нечаканае: цэрквы ў Амерыцы аб'ядноўваюцца, утвараючы царкву «новага мыслення», якая адмаўляе карысnасць для чалавека якіх-небудзь дыпламатычных прадпісанняў. І «святар» у ёй мае хутчэй адміністратыўныя абавязкі, чым права «на духоўны аўтарытэт».

Некаму падаецца незразумелым, чаму апошнім часам у рэспубліку завітвае так многа місіянераў. А што можа быць натуральней за чалавечае жаданне дапамагчы бліжняму?

Калі не блытацца ў палітыцы і канфесіях, напаўжывых афіцыйных структурах, а наглядзець на гэта, як на шлях чалавецтва да спасціжэння самога сябе, мы ўбачым, што можам проста адказаць даверам на давер. У рэшце рэшт, не у канфесійных межах сутнасць. За межамі ўсіх падзелаў мы застаемся людзьмі з непаўторным асабістым вопытам. Каштоўным можа быць толькі гэты вопыт, «ад сэрца да сэрца», які добраахвотна даруецца другому. Каштоўным можа быць разуменне нашай планетарнай сувязі і ўзаемазалежнасці, і ў выніку гэтага — пошук новых шляхоў, узаемнае ўзбагачэнне як адзін з натуральнейшых працэсаў.

Н. ЖУК.

ЛЮСТЭРКА

## Ваша меркаванне ці ...

«Сучаснае палітычнае становішча: ваша меркаванне» — тэма анкеты, якую таксама распрацаваў універсітэцкі сацыялагічны навукова-даследчы цэнтр.

Як і раней, нам дапамагае вядучы навуковы супрацоўнік **Лідзія Георгіеўна НОВІКАВА.**

Нават тыя, хто лічыць сябе па-за палітыкай, усё роўна сутыкаюцца з разнастайнымі праблемамі, якія звязаны нейкім чынам з ёй. Здаецца, наша грамадства— самае палітызаванае. У спакоі адчуваюць сябе толькі 10,9 працэнта апытаных. А прымала ўдзел у даследванні 1465 чалавек з усёй рэспублікі. Лідзія Георгіеўна запэўніла нас, што даследванні можна лічыць у поўнай меры аб'ектыўнымі: улічваліся пры гэтым адукацыя, сацыяльны статус, род заняткаў, месца жыхарства, нацыянальнасць, пол, узрост.

Пачыналася анкета з выяўлення адносін нашых людзей да Кастрычніцкай сацыялістычнай рэвалюцыі. Ці была рэвалюцыя заканамернай і ці своечасова вывела краіну на новы ўзровень развіцця? А можа гэта было даўчасна? Ці наогул з'явілася значным дзяржаўным пераваротам, які перапыніў нармальнае цывілізаванае развіццё краіны?

Адна трэцяя частка апытаных лічаць Кастрычніцкую рэвалюцыю злачынствам, а сярод 16 працэнтаў рэспандэнтаў, якія ставяцца да гэтага факта як да заканамернага — 40 працэнтаў «упраўленцаў».

Калі гэта так, то нехта павінен несці адказнасць за злачынны камуністычны рэжым. Хто? І тут уступаюць у гульню штампы масавай свядомасці: 63,7 працэнта лічаць, што хтосьці абавязкова павінен несці адказнасць, 52,6 працэнта апытаных бачаць сярод злачынцаў былых работнікаў вышэйшага звяна партыйна-дзяржаўнага апарата. Цікава, што ўсе апытаныя, незалежна ад сацыяльнага становішча, вылучылі ў дзеяннях КПСС чатыры асноўныя злачынствы. Сярод іх рэпрэсіі 1936-1940 гадоў, высяленне малых народаў (крымскіх татараў, калмыкаў і інш.), чарнобыльская катастрофа і спроба папярэдзіць развал СССР з дапамогай ваеннай сілы. Маюцца на ўвазе падзеі ў Тбілісі 1989 года і ў Вільнюсе 1991 года.

Зараз, калі КПСС яўна ў заняпадзе, ні эканамічнае, ні палітычнае становішча аднак не палепшылася. Ці ёсць сілы, вінаватыя ў гэтым? «Ёсць!» — 75,1 працэнта. 49,7 працэнта лічаць вінаватым у складаным становішчы ўсё той жа партыйна-дзяржаўны апарат. Аднак 27,5 працэнта мяркуюць, што ўсе нашыя беды — справа рук мафіі. А «ўпраўленцы» абвінавачваюць так званых дэмакратаў і гаспадарчых кіраўнікоў: дырэктараў заводаў, саўгасаў.

Вядома, што ў некаторых заходнееўрапейскіх краінах нават прынятыя законы, якія забараняюць былым партыйным функцыянерам займаць кіруючыя пасады. Ці мае патрэбу ў такім законе Беларусь? «Так»,— лічыць большасць апытаных (64,6 працэнта).

І ўсё ж, выйсце з эканамічнага і палітычнага крызісу дзесьці павінна быць: 60,8 працэнта ўпэўнены ў тым, што трэба хутчэй уводзіць рынкавыя механізмы. Каля 20 працэнтаў жадаюць вярнуцца да сістэмы дзяржаўнага рэгулявання эканомікі, зрабіць усё, як было раней. А для гэтага, як лічаць 39,6 працэнта апытаных, патрэбна «цвёрдая рука» у кіраўніцтве грамадствам, увядзенне жорсткай дысцыпліны, пакаранне балбатуноў. І ўсё ж, чацвёртая частка, на шчасце, за поўную дэмакратызацыю грамадства, знішчэнне рэшткаў былых структур.

Беларусізацыя — гэта не панацэя ад усіх бедаў. Галоўнае ў гэтай справе — паступовасць. Толькі 2,4 працэнта апытаных жыхароў Беларусі размаўляюць на беларускай мове звычайна: у сям'і, з сябрамі, з калегамі на рабоце. Толькі на рускай мове размаўляюць 56,6 працэнта. А на беларускай і рускай мове, у залежнасці ад пэўнага становішча, размаўляе адна трэцяя частка рэспандэнтаў.

Наогул, жыхары нашай рэспублікі настроены на двухмоўе — 75,1 працэнта.

Установкі ж толькі на беларусізацыю прытрымліваюцца 10,6 працэнтаў тых, хто адказаў на пытанні анкеты, на русіфікацыю — 17,2 працэнта. Менш за ўсё імкнуцца да беларусізацыі, вядома, прадпрымальнікі і таксама спецыялісты народнай гаспадаркі (інжынеры, выкладчыкі, урачы).

Т. КАЗАК.

## У НЯДЗЕЛЮ



(Чытайце 3-ю старонку).

З-ЗА МЯЖЫ

## МАСКВА МЯНЯЕ ПАДЫХОД

У канцы мая на журфаку адбылася сустрэча з дэканам факультэта журналістыкі МДУ Я. М. Засурскім.

Пасля развалу Саюза універсітэты патроху страчваюць сувязі, а абмен вопытам насуперак палітычным рэарганізацыям застаецца карысным. Таму размова ішла пра арганізацыю навучання.

Факультэт журналістыкі МДУ рыхтуе цяпер кадры толькі для Расіі. Намячаюцца тэндэнцыі перавесці навучанне на камерцыйныя рэйкі. Ва ўсялякім разе, абазначыліся памкненні да арганізацыі гасразліковых курсаў або стацыянарнага платнага навучання.

Другі год у МДУ (а ў нас — першы) заняткі цягнуцца акадэмічную гадзіну, што дае магчымасць вызваліць час для практыкі. Я. М. Засурскі адзначыў, што змяніўся падыход да навучання студэнтаў. Раней, навучаючы, дэкларавалі: «Ты павінен рабіць так», зараз у студэнтаў з'явілася магчымасць самафарміравацца, выбіраючы сярод шматлікіх альтэрнатыўных курсаў.

АДДЗЯЛЕННЕ СУВЯЗІ

## ДЗЕНЬ ПЕРАМОГІ — КОЖНЫ ДЗЕНЬ

Дзень Перамогі мы святкуем толькі раз у год. І быццам стараемся ўмясціць у яго ўсю памяць аб вайне і ўсю сваю віну перад ветэранамі. А яны былі б значна шчаслівейшымі, калі б адчувалі нашу павагу штодзённа...

Ва універсітэце віншавалі ветэранаў 8 мая. Шчырую ўдзячнасць хочацца выказаць Народнаму хору ветэранаў вайны і працы Белсаўпрофа, які выступіў у гэты дзень. Прагучалі песні ваенных гадоў і нашых дзён, у тым ліку такія знакамітыя, як «Жураўлі» і «Арыёза маці». На вачах многіх слухачоў былі слёзы, абыякавым не застаўся ніхто. Гэта сведчыць аб тым, што ў такія цяжкія часы не зачарсцвелі нашы душы, і добрае знаходзіць у іх водгук.

Канцэрт распачаў ручаёк дружбы і супрацоўніцтва паміж Народным хорам ветэранаў вайны і працы Белсаўпрофа і Народным хорам выкладчыкаў і супрацоўнікаў універсітэта. Няхай гэты ручай стане паўнаводнай ракой!

В. ДАЙНЭКА,
галоўны бібліятэкар бібліятэкі БДУ.

# КАЛЕКТЫЎНЫ ДАГАВОР

# ПРАФСАЮЗНАГА КАМІТЭТА

# І АДМІНІСТРАЦЫІ БЕЛДЗЯРЖУНІВЕРСІТЭТА НА 1992 ГОД

### Раздзел І. АГУЛЬНЫЯ ПАЛАЖЭННІ

1.1. Калектыўны дагавор пасля папярэдняга абмеркавання ў падраздзяленнях заключаецца паміж калектывам супрацоўнікаў Белдзяржуніверсітэта, які прадстаўлены прафсаюзным камітэтам, і адміністрацыяй універсітэта тэрмінам на 1 год і з моманту падпісання яго бакамі.

1.2. Адміністрацыя ў асобе рэктара універсітэта і прафсаюзны камітэт у асобе старшыні прафкома абавязуюцца забяспечваць бесперапынны кантроль за выкананнем усіх умоў дагавора.

1.3. Прамежныя справаздачы аб ходзе выканання Калектыўнага дагавора заслухваюцца кожнае паўгоддзе на сумесных пасяджэннях рэктарата і прафкома з запрашэннем адказных і зацікаўленых асоб. Справаздачу аб выніках выканання абавязацельстваў за год адміністрацыя і прафком праводзяць на канферэнцыі працоўнага калектыву.

1.4. Пры выдзяленні універсітэту дадатковых плошчаў адміністрацыя абавязуецца размяркоўваць факультэты і службы максімальна кампактна.

1.5. Адміністрацыя і прафком абавязуюцца інфарміраваць супрацоўнікаў аб усіх прымаемых рашэннях (размеркаванне жылля, аўтамабіляў, фондавага абсталявання, аб прэміраванні і г. д.).

1.6. Палажэнні працоўнага дагавора распаўсюджваюцца на ўсіх членаў калектыву, незалежна ад таго, ці з'яўляюцца яны членамі прафсаюза.

1.7. Адміністрацыя абавязуецца ў месячны тэрмін пасля падпісання тыражаваць сапраўдны дагавор і раздаць яго ўсім падраздзяленням, уключаючы кафедры, лабараторыі і г. д.

1.8. Пры невыкананні калектыўнага дагавора, паўторным зрыве тэрмінаў выканання пагадненняў і абавязацельстваў прафком, канферэнцыя працоўнага калектыву разглядаюць пытанне аб адпаведнасці займаемай пасады адказнага выканаўцы.

### Раздзел 2. ВЫКАНАННЕ ПЛАНА САЦЫЯЛЬНА І ЭКАНАМІЧНАГА РАЗВІЦЦЯ УНІВЕРСІТЭТА

2.1. Завершыць да пачатку 1992/93 навучальнага года пераўтварэнне факультэтаў, кафедраў і служб універсітэта з улікам дадаткова выдзеленых памяшканняў і будынкаў.

**Адк. Рэктарат.**

2.2. Ажыццяўляць пастаянны кантроль за ходам будаўніцтва 120-кватэрнага жылога дома на вуліцы Варанянскага.

**Адк. Рэктарат, прафком.**

2.3. Аплаціць са сродкаў фонду навукова-тэхнічнага і сацыяльнага развіцця 60 тыс. рублёў за пуцёўкі, якія набываюцца супрацоўнікамі універсітэта самастойна, з аплатай кожнай у памеры 70 працэнтаў ад кошту.

**Адк. Гал. бухгалтар, старшыня прафкома.**

2.4. Аплочваць са сродкаў сацыяльнага страхавання санаторныя пуцёўкі, якія выдзяляюцца супрацоўнікам універсітэта, у памеры 90 працэнтаў ад іх кошту.

**Адк. Гал. бухгалтар, старшыня прафкома.**

2.5. Выплочваць матэрыяльную дапамогу малазабяспечаным сем'ям, якія маюць чацвёра і больш дзяцей, і даход на аднаго члена сям'і, які не перавышае 2 мінімальных акладаў, адзін раз у год у суме аднаго службовага аклада.

**Адк. Гал. бухгалтар.**

2.6. Выплочваць разавую дапамогу:

— пры выхадзе на пенсію супрацоўніка універсітэта ў памеры месячнага аклада;

— сям'і памершага супрацоўніка універсітэта, а таксама пры смерці сваякоў, якія знаходзіліся на ўтрыманні супрацоўніка універсітэта, згодна з заканадаўствам.

**Адк. Рэктарат, прафком.**

### Раздзел 3. АПЛАТА І НАРМІРАВАННЕ ПРАЦЫ

3.1. Рэктарату і прафкому сумесна з вышэйстаячымі арганізацыямі дабівацца ўвядзення ў дзеянне Вярхоўным Саветам Рэспублікі Беларусь «Закона аб народнай адукацыі ў Рэспубліцы Беларусь» у поўным аб'ёме з 1992 года.

**Адк. Рэктарат, прафком.**

3.2. Устанавіць сярэднюю велічыню вучэбнай нагрузкі ў 1992—1993 навучальным годзе ў разліку на аднаго выкладчыка ў колькасці 720 гадзін, пры гэтым лекцыйна-семінарская нагрузка прафесараў і дацэнтаў павінна быць не менш 130 гадзін. Сумарная нагрузка па кафедры, якая перавышае сярэднюю велічыню, аплочваецца як пагадзінная.

**Адк. Рэктар.**

3.3. Размеркаванне пагадзіннай нагрузкі ў падраздзяленнях узгадняецца з іх прафсаюзнымі бюро.

**Адк. Дэканы факультэтаў, старшыні прафбюро.**

3.4. Устанавіць аб'ём аўдыторных вучэбных заняткаў у 1992—1993 навучальным годзе не болей за 36 гадзін у тыдзень.

**Адк. Дэканы факультэтаў.**

3.5. З мэтай захавання інтэлектуальнага патэнцыялу навукова-даследчых падраздзяленняў універсітэта дазволіць навуковым супрацоўнікам пры адсутнасці фінансавання працаваць па графіку няпоўнага працоўнага тыдня, альбо выкарыстоўваць на працягу 1992 года неаплочваемыя водпускі працягам да паўгода без перарывання працоўнага стажу і з захаваннем сацыяльных гарантый.

**Адк. Рэктар, кіраўнікі навуковых падраздзяленняў, старшыня прафкома.**

3.6. Прадаставіць адміністрацыі права афармлення на работу супрацоўнікаў універсітэта, якія дасягнулі пенсійнага ўзросту і зноў прымаюцца на кантрактнай аснове; падрыхтаваць сістэму кантрактнага найму работнікаў навуковых падраздзяленняў універсітэта.

**Адк. Рэктар, кіраўнікі навуковых падраздзяленняў, старшыня прафкома.**

3.7. Аплату працы ажыццяўляць у адпаведнасці з зацверджанымі стаўкамі і акладамі з 3 да 5 і з 18 да 20 чысла кожнага месяца, а ў выпадку супадзення названых дат з выхаднымі днямі — у дні, папярэднія выхадным.

Забяспечыць атрыманне зарплаты праз ашчадныя касы (па заяве) да 12 чысла кожнага месяца.

Штоквартальна даводзіць да падраздзяленняў інфармацыю аб дэпаніраваных выплатах (сумах).

Выплату стыпендыі ажыццяўляць у адпаведнасці з распараджэннямі па факультэтах з 15 да 17 чысла кожнага месяца, а ў выпадку супадзення названых дат з выхаднымі днямі — у дні, папярэднія ім.

**Адк. Гал. бухгалтар, дэканы факультэтаў.**

3.8. За паспяховае выкананне і перавыкананне тэматычнага плана работ выплочваць прэміі на аснове загада, які выдаецца не пазней 30 красавіка. Памеры прэміі ў спісе прэміраваных узгадняць з прафсаюзнымі арганізацыямі кафедраў, лабараторый, факультэтаў, службаў.

**Адк. Гал. бухгалтар, старшыня прафкома.**

3.8. Выплату матэрыяльнай аднаразовай дапамогі студэнтам ажыццяўляць па меры паступлення заяў.

**Адк. Гал. бухгалтар.**

### Раздзел 4. ПАДРЫХТОЎКА КАДРАЎ І ПАВЫШЭННЕ КВАЛІФІКАЦЫІ

4.1. У сувязі з падрыхтоўкай да пераходу на двухузроўневую сістэму падрыхтоўкі кадраў вучэбнаму аддзелу, факультэтам і кафедрам распрацаваць да 1 чэрвеня 1992 года новыя вучэбныя планы. Навучанне студэнтаў набору 1992 г. пачаць па новых вучэбных планах.

**Адк. Прарэктар па вучэбнай рабоце, дэканы.**

4.2. Забяспечыць умовы павышэння кваліфікацыі выкладчыкаў і супрацоўнікаў усіх форм навучання, згодна з планамі падраздзяленняў і перспектыўным планам развіцця універсітэта.

**Адк. Рэктарат, вучэбны аддзел.**

4.3. Пашыраць навукова-тэхнічную інфармаванасць прафесарска-выкладчыцкага саставу і студэнтаў універсітэта аб найноўшых дасягненнях навукі і тэхнікі шляхам арганізацыі выставак у бібліятэцы.

**Адк. Дырэктар бібліятэкі, АНТІ.**

4.4. Садзейнічаць выпуску заказных манаграфій супрацоўнікаў універсітэта, якія працуюць над доктарскімі дысертацыямі.

**Адк. Рэктарат.**

4.5. Камандзіраванне ў замежныя ВНУ і на фірмы (навуковая работа, стажыроўка, вучоба) афармляць толькі на аснове рэкамендацый Саветаў факультэтаў (у выпадку асаблівай тэрміновасці афармленне — па рэкамендацыі дэканаў з пазнейшым зацвярджэннем на Саветах).

**Адк. Прарэктар па замежных сувязях, дэканы факультэтаў.**

### Раздзел 5. ВЫТВОРЧАЯ І ПРАЦОЎНАЯ ДЫСЦЫПЛІНА

5.1. Супрацоўнікі і студэнты універсітэта абавязуюцца выконваць вытворчую і працоўную дысцыпліну, палажэнні службовых інструкцый, правілаў унутранага распарадку, праяўляць нецярпімасць да парушальнікаў.

Адміністрацыя абавязуецца:

5.2. Правесці аналіз і ўнесці карэктывы ў службовыя інструкцыі з улікам Палажэння аб вышэйшай навучальнай установе.

**Адк. Кіраўнікі падраздзяленняў.**

5.3. Да 1.01.93 г. распрацаваць і выдаць вытворчы каляндар універсітэта на 1993 год.

5.4. Распрацаваць і ўстанавіць для ўсіх падраздзяленняў універсітэта рэгламентаваны распарадак дня, прадугледзеўшы магчымасці выкарыстання зменнага графіка работы супрацоўнікаў, якія не звязаны з вучэбным працэсам, і ўсклаўшы адказнасць за абавязковае выкананне гэтых графікаў на працоўныя калектывы.

**Адк. Рэктарат, аддзел кадраў.**

Прафсаюзныя камітэты абавязуюцца:

5.5. Праводзіць тлумачальную работу па пытаннях працоўнага заканадаўства і добрасумленных адносін да працы з арганізацыяй юрыдычных кансультацый.

Адміністрацыя і прафсаюзныя камітэты абавязуюцца:

5.6. Разглядваць скаргі і канфліктныя сітуацыі і прымаць па іх рашэнні ва ўстаноўленыя тэрміны.

5.7. Забяспечваць галоснасць і наглядласць у прыняцці мер заахвочвання за добрую працу і дысцыплінарнага ўздзеяння на парушальнікаў працоўнай дысцыпліны, грамадскага і ўнутранага парадку.

### Раздзел 6. АХОВА ПРАЦЫ

Адміністрацыя абавязуецца:

6.1. Своечасова праводзіць усе віды інструктажаў (уводны, на працоўным, вучэбным месцы, бягучы і пазапланавы) па ахове працы і супрацьпажарнай прафілактыцы.

**Адк. Аддзел аховы працы, кіраўнікі падраздзяленняў.**

6.2. Рэгулярна праводзіць навучанне і праверку ведаў супрацоўнікаў і студэнтаў, якія заняты на работах з павышанай небяспекай.

**Адк. Аддзел аховы працы, кіраўнікі падраздзяленняў.**

6.3. Своечасова забяспечваць супрацоўнікаў універсітэта спецадзеннем, спецабуткам і сродкамі індывідуальнай аховы ў адпаведнасці з існуючымі нормамі і правіламі.

**Адк. Прарэктар па АГР.**

6.4. Удакладніць пералік падраздзяленняў, работнікаў і студэнтаў, якія працуюць і вучацца ў шкодных умовах, забяспечваць кантроль за прадастаўленнем прадугледжаных заканадаўствам ільгот (дадатковы адпачынак, скарочаны працоўны дзень, ільготна-прафілактычнае харчаванне і малако, надбаўкі да службовых акладаў).

**Адк. Аддзел аховы працы, прафком.**

6.5. Арганізаваць правядзенне аналізу паветранага асяроддзя ў памяшканнях універсітэта, адзнаку эфектыўнасці работы вентыляцыйных ўстановак, замеры супраціўлення ізаляцыі, зазямляючых прыстасаванняў, асвечанасці працоўных месцаў, тэмпературнага рэжыму ў лабараторыях, аўдыторыях і іншых памяшканнях, г. зн. прывядзенне памяшканняў у адпаведнасць з дзейнічаючымі санітарнымі нормамі і правіламі.

**Адк. Аддзел аховы працы, галоўны інжынер.**

6.6. Праводзіць цэнтралізаваную праверку сродкаў абароны.

**Адк. Галоўны энергетык.**

6.7. Скараціць да мінімуму колькасць вячэрніх заняткаў для выкладчыкаў-жанчын, якія маюць дзяцей школьнага ўзросту, і выключыць вячэрнія заняткі для жанчын, якія маюць дзяцей дашкольнага ўзросту.

**Адк. Заг. кафедраў.**

6.8. Забяспечыць безумоўнае выкананне мерапрыемстваў па ахове працы, якія прадугледжаны Пагадненнем.

**Адк. Аддзел аховы працы і інжынерныя службы універсітэта.**

6.9. Сістэматычна праводзіць тлумачальную работу сярод супрацоўнікаў і студэнтаў універсітэта па прафілактыцы вытворчага траўматызму і захворванняў.

6.10. Ажыццяўляць кантроль за забеспячэннем супрацоўнікаў (студэнтаў), якія працуюць ці вучацца ў шкодных умовах, спецадзеннем і спецхарчаваннем.

Адміністрацыя і прафсаюзныя камітэты абавязуюцца:

6.11. Прымаць удзел у распрацоўцы планаў мерапрыемстваў па ахове працы на аснове прапаноў працоўных калектываў і ажыццяўляць кантроль за іх выкананнем.

6.12. З улікам экалагічнага становішча і з мэтай своечасовага выяўлення захворванняў на працягу 1992 года правесці медыцынскую дыягностыку ўсіх супрацоўнікаў універсітэта.

### Раздзел 7. ЖЫЛЛЕВА-БЫТАВЫЯ ЎМОВЫ

7.1. Прадастаўленне жыллёвай плошчы ажыццяўляць у адпаведнасці з чарговасцю з улікам ільгот, што ўстаноўлены інвалідам і ўдзельнікам Вялікай Айчыннай вайны і прыроўненым да іх мнагадзетным сем'ям; маці-адзіночкам; хворым (загад № 330 Мінздрава); сем'ям, якія маюць непаўналетніх блізнят. Скласці льготны спіс тых, хто мае патрэбу. Выдзеліць гэтай групе асоб да 20 працэнтаў выдзяляемага фонду.

7.2. У адпаведнасці з законам аб зямлі дабівацца выдзялення зямельных участкаў для ўсіх жадаючых супрацоўнікаў універсітэта і дадатковых участкаў тым, у каго яны менш чым 6 сотак.

**Адк. Рэктарат, прафком.**

7.3. Пры паляпшэнні жыллёвых умоў дазволіць выдзяленне жылля супрацоўнікам універсітэта, якія маюць да 8 кв. м жыллёвай плошчы на аднаго члена сям'і.

### Раздзел 8. САЦЫЯЛЬНАЕ СТРАХАВАННЕ І ГРАМАДСКАЕ ХАРЧАВАННЕ

Адміністрацыя абавязуецца:

8.1. Забяспечыць бесперабойную работу ўсіх пунктаў грамадскага харчавання (сталовыя, буфеты, кафэ) універсітэта. Дабівацца паляпшэння якасці прыгатавання ежы. А таксама:

а) забяспечыць транспартам сталовыя №№ 33, 34 і стол заказаў,

б) арганізаваць гандаль кулінарнымі вырабамі і паўфабрыкатамі праз буфет геафака.

8.2. Забяспечыць парадак у абедзенных залах з мэтай выканання санітарна-гігіенічных нормаў.

Прафсаюзныя камітэты абавязуюцца:

8.3. Арганізаваць сістэматычную работу стала заказаў для выкладчыкаў і супрацоўнікаў універсітэта.

8.4. Ажыццяўляць рэгулярны грамадскі кантроль за работай сталовых і буфетаў універсітэта супрацоўнікамі і студэнтамі, якія працуюць, вучацца і пражываюць у адпаведных карпусах, з мэтай паляпшэння якасці харчавання і пашырэння асартыменту.

8.5. Забяспечыць супрацоўнікаў і студэнтаў універсітэта льготнымі пуцёўкамі ў санаторыі, дамы адпачынку, пансіянаты, на дыетхарчаванне. Сумесна з рэктаратам набываць дадатковыя пуцёўкі на лячэнне і адпачынак за кошт фонду сацыяльнага развіцця універсітэта (п. 2.5. дагавора).

Адміністрацыя і прафсаюзныя камітэты абавязуюцца:

8.6. Аказваць супрацоўнікам і студэнтам бязвыплатную матэрыяльную дапамогу (з фонду сацыяльнай дапамогі рэктарата і прафкомаў).

8.7. Аказваць разавую лячэбную дапамогу супрацоўнікам з фонду эканоміі заработнай платы.

8.8. Усім жанчынам, па жаданню, прадастаўляць штомесячна адзін неаплочваемы свабодны ад работы дзень.

### Раздзел 9. КУЛЬТУРНА-ВЫХАВАЎЧАЯ І СПАРТЫЎНА-МАСАВАЯ РАБОТА

9.1. Забяспечыць фінансаванне груп «Здароўе» ў адпаведнасці з каштарысам работы прафкома.

**Адк. Прафком.**

9.2. Аказваць падраздзяленням дапамогу ў арганізацыі экскурсійных паездак па гістарычных і культурных цэнтрах краіны, асабліва ў час адпачынку.

9.3. Арганізаваць цэнтралізаванае забеспячэнне білетамі на канцэрты, у кіно і ў тэатры.

9.4. Арганізоўваць урачыстыя вечары, прысвечаныя знамянальным датам, тэматычныя вечары, творчыя справаздачы народных калектываў, выстаўкі народнай творчасці.

**Адк. Рэктарат, прафком.**

### Раздзел 10. МЕДЫЦЫНСКАЕ АБСЛУГОЎВАННЕ, АДПАЧЫНАК І САНІТАРНА-КУРОРТНАЕ ЛЯЧЭННЕ.

10.1. Правесці на базе паліклінікі універсітэта і прафілакторыя медыцынскі агляд супрацоўнікаў па іх жаданню.

**Адк. Рэктарат.**

**Тэрмін — IV квартал 1992 года.**

10.2. Прадаставіць для адпачынку супрацоўнікаў БДУ Вілейскую вучэбную базу ў вольны ад вучэбнай практыкі час.

**Адк. Рэктарат, прафком.**

**Тэрмін — ліпень, жнівень, верасень.**

10.3. Забяспечыць правядзенне адпачынку выкладчыкаў і супрацоўнікаў і канікул студэнтаў шляхам прадастаўлення пуцёвак на:

а) санаторна-курортнае лячэнне;

б) адпачынак у спартыўна-аздараўленчым лагеры;

в) адпачынак па пуцёўках міжнароднага турызму;

г) адпачынак дзяцей супрацоўнікаў і студэнтаў у дзіцячых піянерскіх лагерах.

10.4. Аказваць дапамогу тым, хто мае патрэбу, з фонду прафкома ў памеры 10—12 працэнтаў ад агульных сум прафсаюзнага бюджэту.

